*В.У. Дамашэвіч, В.Г. Лапаева*
БДЭУ (Мінск)

# УЗДЗЕЯННЕ ПРАВАРАЗУМЕННЯ АНТЫЧНЫХ МЫСЛІЦЕЛЯЎ НА ПРАВАВУЮ ДУМКУ РЭНЕСАНСАВАЙ БЕЛАРУСІ

Прадстаўнікі беларускага Адраджэння XV1 ст. шырока выкарыстоўвалі антычную культурную спадчыну (спачатку рымскую, а потым грэчаскую), нібыта "адраджаючы" яе пасля працяглага забыцця ў сярэдневяковым грамадстве. Менавіта ў гэты час жылі асноватворцы айчыннай культуры, нацыянальнага духу, беларускай ідэі: Францыск Скарына, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Леў Сапега, Андрэй Волан, Міхалон Ліцвін.

Як дзеяч эпохі Адраджэння, Ф.Скарына развіў тэорыю натуральнага права і дагаварнога паходжання дзяржавы. Ён прапанаваў сваю ўласную класіфікацыю права, якая найбольш поўна выкладзена ў прадмове да кнігі "Другі закон Маісееў". Як і Арыстоцель Скарына падзяляе права на натуральнае і пісанае. На яго думку натуральнае права (Ф.Скарына называе яго "прироженым") закладзена ў самой істоце чалавека. Яно аднолькавае для ўсіх людзей, уласціве кожнаму і не залежыць ад месца і часу. На аснове норм натуральнага права павінна будавацца сістэма норм пісанага права — дзеючага заканадаўства.

Францыск Скарына быў першым беларускім мысліцелем, які паставіў і разглядзеў праблему суадносін права і закона. Пад паняццем "права" ён разумеў сістэму раннехрысціянскіх маральных норм, якія стварылі ідэал права — права натуральнага. Ён імкнуўся вызначыць яго сутнасць і лічыў, што дасканаламу ў інтэлектуальным і маральным сэнсе чалавеку законы не патрэбны, ён кіруецца ў грамадскім жыцці натуральным законам. Гэта пераклікалася з поглядамі антычных філосафаў, у прыватнасці, Арыстоцеля.

У той жа час Ф. Скарына добра разумеў неабходнасць права ва ўмовах грамадства. Закон павінен служыць агульнаму дабру і грунтавацца на маралі, справядлівасці і чалавекалюбстве. Менавіта на аснове гэтых прынцыпаў, лічыў ён, і павінны складацца юрыдычныя законы, выконвацца правасуддзе, ажыццяўляцца дзяржаўнае кіраванне і палітыка. Закон павінен быць годным для выканання, карысным для насельніцтва і адпавядаць звычаям, часу і месцу. Ў свой час Арыстоцель і Платон таксама разумелі пад законамі не сукупнасць прававых, а хутчэй сукупнасць маральных норм.

Усталяванне ў грамадстве законнасці і правапарадку залежыць, на думку Скарыны, ад тых, каму наканавана быць манархам, правіцелем, у чым ён пагаджаўся з Платонам, які ставіў жыццядзейнасць дзяржавы і дабрабыт грамад-

зян у залежнасць ад асабістых рыс кіраўніка дзяржавы. Больш таго, Сакрат таксама пісаў: "Правіць павінны тыя, хто ведаюць".Васпан павінен быць набожным, мудрым і справядлівым, адукаваным, дабрачынным і чулым да сваіх падданых. Францыск Скарына лічыў асветную, гуманную і моцную манархію лепшай формай кіравання грамадства, а адукаванага манарха — тым кіраўніком, які можа заслужыць павагу і любоў грамадзян, уладкаваць найлепшым чынам жыцце народа; што пераклікаецца з ідэяй Арыстоцеля, выказанай у "Этике", дзе ён безумоўна называе найлепшым дзяржаўным кіраваннем царскую уладу, не гледзячы на тое, што ў "Политике" Арыстоцель гаворыць аб паліціі, як аб ідэальнай форме дзяржаўнага уладкавання.

Узорамі жа дзеля мудрага ўладкавання дзяржавы для Скарыны служылі антычныя стваральнікі законаў: афінянін Салон, старажытнаспартанскі рэфарматар Лікург, рымлянін Нума Пампей, заступнік навук і мастацтва, Саламон, Пталамей Філадэльф і інш. Галоўнай мэтай дзяржавы Скарына лічыў агульную карысць і згоду.

Пераймальнік лепшых набыткаў старажытнагрэчаскай палітычнай культуры, ідэй Арыстоцеля і Цыцэрона на шляхі развіцця дзяржавы і грамадства, Скарына аддае перавагу прыярытэтам агульначалавечых духоўных вартасцей перад індывідуальнымі, нярэдка эгаістычнымі памкненнямі асобы.

Сымон Будны працягнуў справу Францыска Скарыны, уносячы значны ўклад у развіцце культуры славянскіх народаў. У творах Ф. Скарыны і С. Буднага ўплыў арыстацелізма асабліва відавочны. Гэта і не дзіўна, таму што яны абодва скончылі факультэт вольных мастацтваў Кракаўскага універсітэта, які сучаснікі звалі "школай Арыстоцеля".

Валодаючы лацінскай, старажытнаяўрэйскай, грэчаскай мовамі С.Будны быў знаёмы з творамі старажытных мысліцеляў, таму ён,суадносячы іх з рэаліямі рэчаіснасці свайго часу, эгаістычнай натурай чалавека, няўхільна падтрымліваў інстытут дзяржаўнай улады і правы ўладара (манарха) на прымус у адносінах да грамадзян.

Палітычным ідэалам у С. Буднага выступае асветніцкая манархія. Сучасныя беларускія вучоныя (Падокшын, Юхо і інш.) адзначаюць,што С. Будны, спасылаючыся на старажытных мысліцеляў (Арыстоцеля, Цыцэрона, Сакрата і інш.) выразна сфармуляваў прынцып вяршэнства закону, які быў народжаны ў антычныя часы. Ён адзначаў, што вельмі важным з'яўляецца падпарадкаванне ўсяго грамадства законам дзяржавы, павага да людзей, якія дамагаюцца гэтага ў імя кожнага паасобку і ўсіх разам. С. Будны ідэалізаваў уладу ад Бога, але не адмаўляў дэмакратычных магчымасцяў авалодання дзяржаўнымі пасадамі. На гэты конт яшчэ Цыцэрон разважаў, што па сваёй прыродзе і па сваёй сутнасці

дзяржава і права носяць боскі характар і заснаваныя на ўсеагульным розуме і справядлівасці.

Як і Ф. Скарына, С. Будны належыў да памяркоўна-гуманістычнага напрамку айчыннай рэнесансавай сацыяльна-палітычнай думкі, які адлюстроўваў інтарэсы прагрэсіўнай шляхты і гараджан, асэнсоўваў неабходнасць некаторых змяненняў у жыцці грамадства, у палітыка-прававой рэфарматарскай дзейнасці выкарыстоўваў працы старажытнагрэчаскіх філосафаў, у прыватнасці Платона, Арыстоцеля і інш. Нагадаем, што галоўнае прызначэнне чалавека Скарына, як і Арыстоцель, бачыў пераважна ў актыўным грамадскім жыцці, у служэнні "агульнаму дабру", Радзіме, народу. Гэта асноватворная скарынінская ідэя атрымала далейшае абгрунтаванне ў філасоўскай і грамадска-палітычнай думцы Беларусі, у тым ліку ў творах С. Буднага.

Магчыма сцвярджаць, што палітыка-прававая навука XVI стагоддзя грунтавалася ў значнай ступені на ідэях Платона, Арыстоцеля, Цыцэрона, зразумела, адаптаваных да айчынных умоў і пераасэнсаваных у святле патрабаванняў новай эпохі.

***Д.Н. Иодель***
БИП (Гродно)

## О ПРАВЕ МОЛОДЕЖИ НА ОБРАЗОВАНИЕ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Благополучие и процветание любого государства во многом зависит от молодого поколения. В Конституции Республики Беларусь гарантируется право молодежи на ее духовное, нравственное и физическое развитие. Государством создаются необходимые условия для свободного и эффективного участия молодежи в политическом, социальном, экономическом и культурном развитии (ст. 32). Полноценное развитие молодого индивида немыслимо без получения целостной системы знаний. Еще Ф. Бэкон вывел формулу: «Знание — сила». В современном мире роль знаний и образования неуклонно возрастает, все больший процент молодежи стремится к получению высшего образования и продолжению послевузовского образования. По состоянию на 2002–2003 уч. год численность студентов вузов в Республике Беларусь составила 488,7 тыс. человек; с 1990 по 2000 гг. количество выпускников вузов выросло с 20,1 % до 25,4 % и основную массу среди них составляла молодежь, число лиц, имеющих законченное высшее, среднее и базовое образование — с 77 % до 85 %.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by